CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

REPORTS
AND ANALYSES

# БЕЛАРУСЬ – прадказальны партнёр?

Войцех Барадзіч-Смаліньскі

Уступ

Падзеі на Беларусі зноў прыцягнулі ўвагу міжнароднай супольнасці, асабліва заходнееўрапейскай. Чарговы раз заклікаецца да змены палітыкі ў адносінах да Беларусі.

Прэзідэнцкія выбары былі самай галоўнай палітычнай падзеяй Беларусі ў 2010 г. Мноства арганізацый і палітыкаў звязвалі з імі вялікія надзеі. На жаль, адзнакі місій назіральнікаў з АБСЕ і СНД цалкам супярэчаць адна адной. АБСЕ прызнала, што Беларусі далёка да выканананьня еўрапейскіх стандартаў, аднак назіральнікі з СНД па традыцыі прызналі выбары цалкам дэмакратычнымі і справядлівымі.

Расійская федэрацыя і іншыя краіны паспяшаліся з віншаваннямі, а міністр замежных спраў РБ Сяргей Мартынаў адправіўся з афіцыйным візытам у Італію.

Беларуская ўлада вырашыла паказаць, хто вырашае правілы гульні і з кім трэба лічыцца. Абурэнне выклікала бязлітасць, моц і маштаб прынятых мер.

## 1. Адносіны Беларусь-Расія і Беларусь-ЕС

Адносіны Расія-Беларусь паступова пагаршаліся ад 2008 г., каб на некалькі дзён перад выбарамі значна палепшыцца. Адразу пасля выбараў Дзмітрый Мядзведзеў заявіў, што выбары ў Беларусі-гэта яе ўнутраная справа. Рэакцыяй Аляксандра Лукашэнкі было хуткае праштурхоўванне праз парламент, які выконваў праблемы пагаднення ў справе Адзінай эканамічнай прасторы (ЕЎрАзЭС).

Можна прыняць тэзіс, што расійска-беларускі канфлікт мог бы быць спрытна зарганізаваным праектам, мэтай якога было частковае змяншэнне фінансавання з расійскага бюджэту. Выдзяленне крэдыту Міжнароднага валютнага фонда не было рашэннем, апартым на чыста эканамічных паказчыках. Палітычнай мэтай крэдыта была спроба адцягнуць Беларусь ад Расіі. Аляксандр Рыгоравіч і яго ўрад здолелі пераканаць МВФ, што Беларусь гатова да эканамічнай рэформы, а Расія магла б сэканоміць каля 2,5 млрд даляраў (столькі складае крэдыт МВФ). Гэтыя грошы і так трэба было б ператрансфераваць на Беларусь. У інтарэсе МВФ так паўплываць на беларускую гаспадарку, каб былі дасягнуты пастаянныя структуральныя змены; гэта быў бы несумнеўны поспех МВФ, рэпутацыя каторага была запэцкана ў выніку міжнароднага эканамічнага крызысу.

Адносіны з Расіяй раптам выпраўляюцца за 10 дзён перад тэрмінам выбараў. Аляксандра Лукашэнку прымае з урачыстасцямі Дзмітры Мядзведзеў. На некаторых парталах з’яўляецца неправераная інфармацыя аб тым, што падчас гэтай сустрэчы лідары дзвух краінаў знайшлі паразуменне не толькі ў пытаннях, якія датычаць экспарту беларускага малака, мяса і іншых прадуктаў харчавання, але таксама адносна ўнармавання валюты і ўвядзення на Беларусі расійскага рубля.

Аляксандр Лукашэнка дзякуючы майстэрскай здольнасці весці шматвектарную палітыку змог за кошт малых саступак і адносна невялікіх крокаў паштурхнуць ЕС да паўторнага адкрыцця дыялогу аб інвестыцыях, лібералізацыі і мадэрнізацыі. Інвестыцыі з Захаду дапамаглі б узмацніць беларускую эканоміку “жывой гатоўкай”.

ЕС здолела адмовіцца ад ідэі „палітыкі 12 крокаў”[1], паменшваючы патрабавання да 5[2] . Сам пачатак палітыкі 12 крокаў быў незвычайна імглісты і нерэальны: не хапала канкрэтыкі ці канкрэтных сум, якіх беларуская дзяржава можа чакаць узамен на праведзеныя рэформы. Машына саступак была аднак уведзеная ў строй і былі выкананы чарговыя крокі, які сведчылі аб тым, што не лічыцца якасць узведзеных зменаў, затое важным з'яўляецца міжнароднае ўраджанне, што “працэс зменаў” распачаўся.

Беларускія ўлады прынялі прынцып, заснаваны на тым, што прапанаваныя праз Еўрапейскі Саюз змены ўводзяцца, але згодна ўласных правілаў. На жаль, Еўрапейскі Саюз не прыняў ніякай формы праверкі эфектыўнасці “рэформаў”. Выбарчы ўстаў, прыняты ў выбарах 2010 г. атрымаў велізарныя змены (між іншым якія датычылі фінансавання кандыдатаў), аднак галоўныя праблемы (датэрміновае галасаванне, выбар членаў выбарчых камісій, свабода правядзення выбарчай кампаніі і г.д.) і прапановы зменаў беларускіх пазаўрадных арганізацый, палітычных партый былі адкінутыя[3].

Таксама на фундаменце паляпшаючыхся адносін з Еўрапейскім Саюзам беларускі бок прыняў змены ў законе аб медыя і непамерна скрупулёзным чынам урэгуляваў “жыццё” беларускага інтэрнету, які і так быў адзіным месцам, дзе інфармацыя аб падзеях у Беларусі распаўсюджваецца неабмежавана.

У 2009-2010 гг. узмацнілася пазіцыя Беларусі ва Усходнім Партнёрстве. Беларусь трактуецца як адзін з самых неабходных партнёраў. У тракце пасяджэнняў тэматычных платформаў[4] беларускі бок з'яўляецца адным з самых актыўных.

---

[1] 21 лістапада 2006 г. Еўрасаюз прадставіў прапанову змены палітыкі ў дачыненні да Мінска, прэзэнтуючы дакумент “Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі”. Дакумент прадставіў выгады, якія атрымае Беларусь, калі яе ўлады выканаюць 12 умоваў, якія служаць дэмакратызацыі палітычнага жыцця .

[2] http://finanse.wnp.pl/ue-gotowa-kredytowac-bialorus,83134_1_0_0.html : [Камісар ЕС] Бэніта Феррэра-Вальдэр пахваліла Беларусь да гатоўнасці да супрацоўніцтва і прадставіла пяць умоваў для развіцця палітычных кантактаў: рэфарміраванне выбарчага закона паводле стандартаў АБСЕ, прымяненне яго ўжо ў найбліжэйшых выбарах, гарантаваць свабоду слова і скліканняў, змяненне заканадаўства ў пытаннях рэгістрацыі пазаўрадавых арганізацый, вырашэнне праблемы палітычных вязняў.

[3] http://www.euroradio.fm/en/1237/news/48595/;

[4] Сустрэчы на ўзроўні высокіх кіраўнікоў міністэрстваў, зааганжаваных у УП з 27 краінаў ЕС і 6 УП.

Актыўнасць Беларусі выклікана эканамічным разлікам. Аляксандр Рыгоравіч разлічвае на рост буйных і прыбытковых інвестыцый з захаду. Усходняе Партнёрства зазначае, што найбольш важным фактарам для зменаў з'яўляецца развіццё малага і сярэдняга бізнэсу. На малых і сярэдніх прадпрыемствах базуецца эканоміка ЕС. Чакаецца павялічванне кантактаў на ўзроўні бізнэсу, якія станоўча паўплываюць на ўзмацненне гэтага сектара ці на ўзмацненне яго голасу ў адносінах з урадам і прэзідэнтам.

Расія не ставарае ў гэтым пытанні праблемаў. УП дзейнічае амаль 3 гады як ініцыятыва, якая яшчэ знаходзіцца на стадыі арганізацыі і стварэння, а канкрэтныя праекты павінны быць абвешчаныя ўжо ў 2011 г. Расія не супраць прысутнасці бізнэсу ЕС на тэрыторыі Беларусі, хіба што даходзіць да канфратацыі бізнэсу.

Польшча шмат працавала над тым, каб ЕС змяніў сваё стаўленне да Беларусі з поўнага замарожвання адносін на аднак абмежаваную адкрытасць практычна без выканання якіх-небудзь умоваў праз Аляксандра Рыгоравіча. Беларускі бок стараецца максімальна выкарыстаць гэтую сітуацыю, даючы ў замен так мала як гэта толькі магчыма.

Беларусь на працягу 2009 і 2010 гг. тэсціравала эластычнасць Еўрапейскага Саюза і ступень яго цярплівасці:

1. Беларусь была адзінай краінай УП, якая адкрытым чынам заблакавала удзел прадстаўніка Форума грамадзянскай супольнасці ў паседжаннях тэматычных платформаў, і таксама адзіная давяла да выключэння з вышэйшай навучальнай установы ўдзельніка Форума грамадзянскай супольнасці.
2. Добрым полем для тэсціравання апынуўся таксама яшчэ тлеючы канфлікт вакол Саюза палякаў на Беларусі і спробы захопу Дома польскага ў Івянцы. Рэакцыя ЕС таксама абмежавалася да выказвання незадавальнення і асуджэння.

Вышэй згаданыя падзеі не пашкодзілі аднак еўрапейскім палітыкам высокага ўзроўня[5] наведваць Беларусь і сустракацца з афіцыйным кіраўніцтвам краіны. Беларусь, не

[5] У 2010 г. Беларусь наведалі між іншым камісар Штэфан Фуэлле, Радаслаў Сікорскі, Гуідо Вэстэрвэлле, Гёран Ліндблад, Даля Грыбаўскайтэ, Вігаўдас Ушаскас

даючы шмат узамен, атрымала тое, ад чаго найбольш залежылі яе адносіны з Захадам, - прызнанне сваіх эліт на міжнародным узроўні.

Улады ў Мінску атрымалі выразны сігнал : "ЕС гатовы да славеснай крытыкі ў адносінах да Беларусі". Часткова гэта мела сваё абгрунтаванне пры стварэнні ініцыятывы Усходняе партнёрства, аднак пазней гэта стала цалкам відавочным элементам, які практычна не падлягаў дыскусіі. З другога боку Еўрапейскі Саюз, рэгулярна прыпыняючы санкцыі для самых важных прадстаўнікоў улады, падцвердзіў, што гэта адзіны механізм, які можа паслужыць дысцыпліне і выражанню сваіх адносін іншым чынам, чым славеснае асуджэнне дзеянняў кіраўніцтва Беларусі.

Становішча Польшчы ў гэтай сітуацыі няпростае. З аднаго боку, у 2011 г. польскае старшынства ў ЕС разглядаецца як вялікі поспех, з другога боку як паражэнне варта было б адзначыць прыпыненне ці выключэнне якіх-небудзь адносін з Беларуссю ў межах ініцыятывы УП.

Па-першае, такое развіццё падзей цяжка ўявіць сабе, бо Беларусь не з'яўляецца адзінай недэмакратычнай дзяржавай, якая ўваходзіць у склад праграмы і ў цэлым не з'яўляецца самай жорсткай (нават на фоне трагічных падзей у снежні 2010 г.) у вырашэнні "праблемы апазіцыі". Азейрбаджан, Арменія, Грузія (вялікае расчараванне Захаду), аб Украіне (апошнія мясцовыя выбары) не нагадваецца. Выключэнне толькі Беларусі прывядзе да паразы ініцыятывы УП, і трэба б тут прызнаць, што Аляксандр Лукашэнка меў рацыю, часта нагадваючы аб тым, што ў дачыненні да яго краіны прымяняюцца двайныя стандарты, якія не былі сфармуляваныя ў дакладнай і празрыстай форме. Па-другое, выключэнне якой-небудзь дзяржавы з УП магло б прывесці да поўнага перафармулявання ідэі Усходняга партнёрства і адначасова неабходнасці абмеркавання гэтага падчас старшынства, што азначала б нядольнасць нашых ідэй і апантаны пошук новай усходняй палітыкі ЕС.

2. Апазіцыя ў Беларусі і грамадзянская супольнасць

Аляксандр Лукашэнка загадаў старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі, каб былі зарэгістраваныя ўсе кандыдаты ў прэзідэнты, якія выканалі ўсе фармальныя працэдуры (збор ініцыятыўнай групы, яе рэгістрацыя і збор 100 тыс. подпісаў за дадзенага кандыдата).
У выніку гэтага рашэння ЦВК зарэгістравала 10 кандыдатаў.

Дзяржаўнаму апарату было даручана не перашкаджаць у кампаніі па збору подпісаў, дапусціць апазіцыйных кандыдатаў да прадстаўлення сваіх праграмаў на афіцыйным тэлебачанні, а таксама адбыліся тэлевізыйныя дэбаты. Сама прысутнасць кандыдатаў у дзяржаўных СМІ не паўспрыяла значнаму ўзросту іх падтрымкі. Фаварытам дзяржаўных медыя застаўся Аляксандр Лукашэнка. Колькасць інфармацыі аб кандыдатах, прадстаўленай ў медыя, складала 89% на карысць дзейнічага кіраўніка дзяржавы. Астатнія кандыдаты былі паказаны ў негатыўным, рэдка нейтральным, свеце.

Аляксандр Лукашэнка сам пазбягаў выбарчых выступленняў і стараўся пазбягаць выбарчых каментарыяў. Аляксандр Рыгоравіч не ўдзельнічаў у дэбатах кандыдатаў і найбольш важны выступ, які датычыў выбарчай праграмы, адбыўся падчас Усебеларускага схода. Пазбяганне выступаў Аляксандрам Лукашэнкам паставіла апазіцыю ў цалкам супярэчлівую атмасферу. Лідар выбарчых аппытанняў паказаў сябе як чалавек, які знаходзіцца па-за падзеламі і не ўдзельнічае ў палітычных сварках.

Апазіцыя сама дазволіла загубіць сябе. Да паражэнняў апазіцыі трэба залічыць факт, што ў той сітуацыі, у якой знаходзіцца Беларусь, на пасаду прэзідэнта кандыдавала так шмат асобаў. Канешне, такія выбары ўвайдуць у гісторыю. Нідзе раней у найноўшай гісторыі Беларусі не было столькі жадаючых да прыняцця пасады кіраўніка дзяржавы і падчас апошніх 16 гадоў кандыдаты не мелі такую свабоду ў абвяшчэнні сваіх ідэяў. ЕС атрымала сыгнал, што “працэс” праграэсуе, бо кандыдаты могуць праводзіць кампанію, подпісы збіраюць на вуліцах, адбыліся дэбаты на тэлебачанні і г.д.

Дыскусіі паміж кандыдатамі на прэзідэнта не ўціхлі нават тады, калі пад канец выбарчай кампаніі стала відавочна, што выбары былі падрыхтаваныя такім чынам, што перамога Аляксандра Лукашэнкі не выклікала ніякіх сумневаў. Прапанова аднога з кандыдатаў, каб у знак пратэсту ўсе апазыцыйныя кандыдаты адмовіліся ад выбараў, была адхілена.

Сярод апазіцыі далей працягваліся партыйныя падзелы і ўнутранае суперніцтва, падзел на маладое і старое пакаленне палітыкаў, сучасная сітуацыя была недаацэненая, стратэгія і тактыка нераспрацаваная. Адсутнасць адзінства- гэта падарунак, які Аляксандр Лукашэнка атрымоўвае з нагоды правядзення кожных выбараў.

Гэта таксама не дапамагае заходнім партнёрам, якія вымушаныя перад кожнымі выбарамі і перад кожнай вялікай падзеяй нанова вывучваць не столькі прозвішчаў апазіцыянераў (гэты спіс на пару гадоў закрыты), колькі іх прыналежнасці да партый ці арганізацый.

Можна паведаміць, што тая энергія, з якой 9 апазіцыйных кандыдатаў праводзілі свае прэзідэнцкія кампаніі, не была скіраваная на тое, каб быць выбраным (такі варыянт быў выключаны штабам як маларэальны), а на тое, каб вылучыць лідара(ў) “новай апазіцыі”, які(я) прывядуць да змены ўлады. Ці скончыўся гэта працэс поспехам – зарана б меркаваць.

## 3. 19 XII 2010 і папярэднія падзеі

Падзеі на Плошчы Незалежнасці стваралі ўраджанне, што быў рэалізаваны спланаваны сцэнар. Ад 13 да 21 снежня ва ўнутраных войсках і міліцыі быў аб'яўлены стан павышанай гатоўнасці, а Міністэрства ўнутраных спраў РБ стварыла Сітуацыйна-аперацыйны штаб.

9 XII 2010 даходзіць да сардэчнай сустрэчы з Дзмітрыем Мядзведзевым. Некалькі дзён пазней да медыя даходзіць інфармацыя, што Беларусь з Расіяй знайшлі паразуменне не толькі ў пытаннях, якія датычаць дапушчэння беларускіх тавараў на расійскі рынак, але таксама ў справе кошту нафты і газу на 2011 г. Столькі поспехаў у дзень напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў на Беларусі азначала, што Аляксандр Рыгоравіч з'яўляецца альбо выдатным перамоўшчыкам, альбо Расійская федэрацыя прызнала, што ён з'яўляецца асобай, якая найлепш адпавядае сярэднечасовым інтарэсам. Задача, пастаўленая Аляксандрам Лукашэнкам, магла б заключацца ў тым, каб так разыграць выбары, каб не было ніякіх сумневаў, хто ёсьць лідарам у Беларусі[6]. Сярод здагадак варта было б задаць пытанне, ці Расіі было вядома аб маштабе і форме дзеянняў, якія будуць прадпрынятыя сіламі падначаленымі дзейнічаючаму кіраўніцтву Беларусі.

Ужо пачынаючы з другой паловы снежня па Мінску ходзіць плётка, што АМАП рыхтаваўся да разгону дэманстрацыі не так як гэта было раней непасрэдна з Кастрычніцкай Плошчы, а з Плошчы Незалежнасці. Дадаткова 15 XII 2010 на спецыяльнай канферэнцыі, падрыхтаванай праз тэлебачанне, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што міліцыя і праваахоўныя органы павінны быць падрыхтаваныя да правакацыі, якая можа адбыцца выбарчым вечарам 19 снежня. Органы бяспекі былі папярэджаны, каб дзейнічаць спакойным і адэкватным спосабам, аднак у выпадку нарушэння закона належыць навесці парадак. Перад выбарамі генеральны пракурор Беларусі раіў грамадзянам не паддавацца на правакацыі і не прыходзіць на плошчу.

[6] У выпадку, калі было б дапушчана да доўгіх пратэстаў на Плошчы Незалежнасці, мы маглі б атрымаць сцэнар, падобны да сцэнара зрэалізаванага праз К. Бакіева: http://csm.org.pl/pl/informacje/news-entry/wojciech-borodzicz-smolinski-czlonek-zarzadu-csm-kurmanbek-salijewicz-bakijew-papierek-lak.html

18 XII 2010 пачаліся папярэднія арышты актывістаў з невялікіх garadoў. У асноўным гэта былі ўдзельнікі пратэстаў 2006 г. Само развіццё падзей падчас дэманстрацыі выглядала некатраляваным праз апазіцыю. Не было падрыхтаваных тэкстаў, не быў прадуманы сцэнар, кандыдаты і члены штабаў кандыдатаў не скаардынавалі гэтую падзею.

Ужо падчас трагічнай ночы 19 XII аказалася, што разгон дэманстрацыі быў справакаваны праз супрацоўнікаў спецслужб, якія напаказ выбілі шкло ў дзвярах дома ўрада.

Падзеі распачатыя ноччу 19 XII ствараюць уражанне спланаваных. Арыштаваныя не толькі ўдзельнікі дэманстрацыі. Паведамленні з Беларусі гавораць аб тым, што праслухоўваюць і вызначаюць уладальнікаў нумяроў мабільных тэлефонаў, якія былі зарэгістраваныя праз станцыі сувязі, размешчаныя вакол Плошчы Незалежнасці.

Турма на Акрэсціна на некалькі дзён перад выбарамі была адрэзана ад астатняй часткі горада. Ускраінных жыхароў правяралі па дарозе дадому. Той, хто не быў прапісаны ў дамах недалёка ад турмы, не мог падыйсці ў яго ваколіцы. У арыштаваннях улады не прыпыняюцца нават перад затрыманнем удзельнікаў спантанных акцый салідарнасці, якія адбываліся пры браме пастарунка і вакол яго мураў. Галоўная група апазіцыйных кандыдатаў затрыманыя, іх дапытваюць супрацоўнікі КДБ (двое кандыдатаў пабітыя : Андрэй Саннікаў і Уладзімір Някляеў). Толькі пасля сямі дзён ад затрымання (27 XII 2010) улады дапусцілі адваката да сустрэчы з Уладзімірам Някляевым.

Падвядзенне вынікаў

Еврапейскі саюз знаходзіцца ў вельмі складанай сітуацыі. Пры адсутнасці практычных сродкаў націску на Беларусь, ён мусіць вельмі моцна прадставіць сваю пазыцыю адносна падзеяў на Беларусі. Ад гэтага залежыць не толькі статус Еўрасаюза як арганізацыі, якая прэтэндуе на імя палітычнага лідара, але таксама рэакцыя ЕС будзе сумай рэакцый дзяржаваў-членаў.

Польшча адной з першых аб’явіла павялічэнне сродкаў для дапамогі грамадзяньскай супольнасці ў Беларусі (3 20 млн злотых да 40 млн злотых), вельмі важным з’яўляецца разумнае выкарыстанне гэтых грошай.

Вельмі важным з’яўляецца павялічванне сродкаў на Праграму Каліноўскага, якая забяспечвае магчымасць вучобы ў Польшчы студэнтам выключаным з беларускіх універсітэтаў. Аднак варта задумацца над тым, ці праграма, рэзультатам якой з’яўляецца доўгатэрміновая эміграцыя таленавітых маладых людзей з Беларусі павінна быць у нейкай ступені абмежавана ці, напрыклад, заключаць абавязацельства, што пасля сканчэння вучобы студэнты павінны вярнуцца на Радзіму?

Непамерна важна, каб абурэнне цэнтральнымі ўладамі не скончылася толькі падтрымкай ініцыятываў, яўна і непэсрэдна накіраваных на пазаўрадныя арганізацыі ў Беларусі апазіцыйнага характару. Гэта можа прывесці да замарожвання/заканчэння мноства добрых праектаў, якія адбываюцца на польска-беларускім памежжы з удзелам абласных і раённых уладаў.

Польшча не можа адмовіцца ад падтрымкі ініцыятываў, накіраваных на ўзмацненне сэктара малага і сярэдняга бізнэсу, нават калі праекты базуюцца на супрацоўніцтве з прадстаўнікамі мясцовых уладаў.

Трэба як мага хутчэй прывесці да спрашчэння і павышэння даступнасці сродкаў Еўрапейскага Саюза для беларускіх арганізацый (зарэгістраваных і незарэгістраваных ці аб’яўленых па-за законам праз беларускія ўлады). Ні адная

пазаўрадная арганізацыя не толькі ў Беларусі не можа дазволіць сабе чакаць рашэнняў грантадальнікаў шмат месяцаў.

У выніку “паслявыбарчых” арыштаванняў у беларускіх турмах апынулася больш за 600 асобаў. У большасці выпадкаў ім было прысуджана альбо штраф, альбо ад 10 да 15 дзён арышту за ўдзел у “хуліганстве” ці “несанкцыянаваных дэманстрацыях”. Еўрапейскі саюз павінен абазначыць паняцце палітычнага вязня такім чынам, каб беларускія ўлады не маглі адмаўляць у наяўнасці у турмах ці пад арыштам людзей затрыманых у выніку ўдзелу ў дэманстрацыях палітычнага характару.

Санкцыяй псіхалагічнага характару можа стаць забарона ўезду не для галоўных прадстаўнікоў Беларусі, але для асобаў, якія бескрытычным чынам выконвалі палітычныя загады і злоўжывалі сваімі абавязкамі: суддзі, пракуроры, міліцыянты, супрацоўнікі КДБ, якія праводзіліператрусы і канфіскацыі, члены камісіі выбарчых участкаў, рэктары і дэканы, адказныя за выключэнне студэнтаў. Гэтыя санкцыі павінны прымяняцца на ўсёй прасторы Шэнген, але таксама Польшча мусіць узнаць дадзеных асобаў як непажаданых да знаходжання ўнутры яе тэрыторыі[7]. Польшча можа выступаць за ўвядзенне такіх правілаў іншымі дзяржавамі.

Каардынацыя дзеянняў на міжнародным узроўні вельмі важная. Зразумела, што ізаляцыя Беларусі нічога не зменіць, аднак краіны ЕС павінны быць гнуткія ў рэагаванні на крызысы. Прыняцце Сяргея Мартынава, міністра замежных спраў РБ, уладамі Італіі ясна паказвае, што каардынацыя паміж дзяржавамі ЕС павінна быць узмоцненая.

---

[7] Такую магчымасць дае артыкул 21 Уставы з дня 13 чэрвеня 2003 г. Аб замежніках **Dz.U.06.234.1694**

**Center for International Relations**

The CIR is an independent, non-governmental think-tank, dedicated to the study of international relations and those foreign policy issues, which are of crucial importance to Poland, Europe and transatlantic relations. CIR carries out its own research projects, prepares reports and analyses and participates in international projects in cooperation with similar institutions in several countries. The center's activities are analytical and educational in character. Since it was founded in 1996, the CIR has become an influential forum for foreign policy analysis and debate, involving leading politicians, diplomats, civil servants, local government officials, businessmen, journalists, students and representatives of other NGOs.

**Our goals are:**

- to strengthen Polish foreign policy and to deepen the knowledge of international relations in Polish society,
- to deepen the understanding of the aims of Polish foreign policy among the political, diplomatic and journalist elites in other countries as well as to make Polish leaders aware of the foreign policy objectives of other countries.
- to influence the most important elements of the foreign policy debate in Poland and abroad

CIR's President and Founder is Ambassador Janusz Reiter.

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

ul. Emilii Plater 25
00-688 WARSZAWA
tel: (+48 22) 646 52 67, 646 52 68
fax: (+48 22) 646 52 58
e-mail: info@csm.org.pl
www.csm.org.pl